Литвинчук И.В., студент 219 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Холупова Л.И.,
доцент, профессор кафедры

# СВЯТА ТРОІЦЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ: ХАРАКТАРЫСТЫКА АБРАДАВАГА КОМПЛЕКСУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЁСКІ ХМЕЛЕВА, ЖАБІНКАЎСКАГА РАЁНУ, БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ)

Завяршэнне веснавога і пачатак летняга цыкла каляндарных свят на Брэстчыне, як і ва ўсіх усходніх славян, суправаджалася траецка-русальнай абраднасцю, звязанай з культам расліннасці і заклікannем будучага ўраджаю. Завяршальнае веснавое свята Сёмуха (Трійца, Трыйца, Трэйца) прымеркавана да хрысціянскага свята ў гонар Святой Троіцы (у каталікаў – Спаслання Духа Святога на апосталаў), якое адзначаецца на пяцідзесяты дзень пасля Пасхі.

Напярэдадні свята, у суботу, кожная сям’я старанна рыхтавалася да яго: прыбіраліся двор, гаспадарчыя пабудовы, хата. Пасля гэтага падлогу засцілалі, а хату ўпрыгожвалі (“уквечвалі”) зелянінай, якую ў некаторых месцах на Брэстчыне называлі “маем”. Гэты звычай з’яўляецца адным з устойлівых і шырако распаўсюджаны ў сённяшняй абрадавай практыцы жыхароў рэгіёна. Калі ў сям’і была жалоба, хату зелянінай не ўпрыгожвалі.

У нядзелю раніцай па-святочнаму апранутыя вяскоўцы ішлі ў царкву або касцёл на ўрачыстае багаслужэнне. Асвячоныя на Сёмуху кветкі і травы захоўвалі і выкарыстоўвалі, калі здаралася няшчасце. Паводле вераванняў палешукоў, траецкая зеляніна была такім жа неабходным прадметам у сям’і, як, напрыклад, вербная галінка або грамнічная свечка. Па значнасці і

урачыстасці Сёмуха ў свядомасці носьбітаў традыцый прыраўноўваецца да Вялікадня.

**Ваджэнне куста**

Яркай рэгіянальная адметнасцю траецкага свята на Брэстчыне з’яўляецца абрад “Ваджэнне куста”, які мае выразную лакальнасць. Галоўнымі кампанентамі гэтага абраду былі ўпрыгожванне зялёнымі галінкамі “куста” і абыход двароў аднавяскоўцаў. Галоўнай гераіняй абрада выбіралі самую прыгожую і годную дзяўчыну вёскі. Яе апраналі ў ільняную сарочку з вышыўкай, потым прыкрашалі зялёнай лістотай – сымваламі маладосці, здароўя, багацця, урадлівасці. Дзяўчаты разам з “кустом” хадзілі па ўсёй вёсцы, заходзячы на кожнае падвор’е, выконвалі абрадавыя песні, у якіх славілі гаспадароў, іх дзяцей, жадалі ім здароўя і багатага ураджаю. “Куст” лічыўся сімвалам ураджаю, бо “дзе куста вадзілі, там пшанічанька радзіла”.  Дзеянні, якія разыгрываліся з удзелам “куста”, былі пабудаваны па адной схеме, але адрозніваліся лакальнымі варыянтамі і дэталямі.

У вёсцы Хмелева абрад “Ваджэнне куста” з’явіўся ў 2014 годзе. Ён і стаў сімвалам свята Дня Вёскі. Да 2014 года Дзень Вёскі праводзілі на свята Яблычны Спас (19 жніўня - у праваслаўных хрысціян), але старэйшыя жыхары вёскі прапанавалі проводзіць свята не у час прэабражэнскага посту і тады працаўнікі Дома Культуры вырашылі праводзіць свята на Троіцу. Аднавяскоўцы адрэагавалі на гэтую змену станоўча.

(“Абрад “Ваджэнне куста” абралі таму, что ён жыў у нашым раёне, быў характэрны для нашай мясцовасці, але, нажаль, знік… . Было шкада страціць абрад, хацелася перадаць яго нашым дзецям… ”  — Наталя Алексееўна Дырман – кіраўнік народнага тэару гумару, гульні і песні “Хмелеўскія валацугі”)

У сваіх старэйшых калег працаўнікі Дома Культуры даведваліся аб ўсіх нюансах абраду: як шэсце хадзіла па вёсцы, якія песні спявалі, што

гаварылі. Інфармацыю бралі у калег з вёскі Залуззе (таксама Жабінкаўскага раёну), дзе ўпершыню і пабачылі гэты абрад яшчэ у 90-я гады.

У гэтай вёсцы працуе Залуззеўскі Дом народнай творчасці. Асноўнай мэтай якога з'яўляецца пошук, адраджэнне і захаванне абрадаў і традыцый Жабінкаўшчыны. У Доме народнай творчасці сабрана ўсё, чым была багата вясковая хата: ад керамічнага посуду да размаляванага куфра, ад кросен да ткацкага станка, самабытныя прыклады ткацтва і вышыўкі мясцовых жыхароў. Усё, што створана талентам і працавітасцю нашых продкаў, што надае своеасаблівасць і цяпло сялянскай хаце.

**Адрозненне абрада у розных раёнах і рэгіёнах Палесся**

У розных мясцовасцях ёсць свае адрозненні. Напрыклад, у Жабінкаўскім раёне спадніцу і кашулю рабілі з кляновых і ліпавых галінак і лісточкаў, галаву ўпрыгожваў зялёны вянок. А ў Іванаўскім раёне аснова ўбору – бярозавыя галінкі. У некаторых раёнах ад Куста адрывалі галінку і пакідалі сабе на памяць. У Хмелева галінкі носяць з сабой і у кожным двары, дзе пабывалі, прымацоўвуюць да брамы (прымацоўваюць бярозавыя галінкі).

На тэрыторыі Усходняга Палесся (Гомельшчына) Куста прыбіралі таксама у кляновыя галінкі, але яшчэ дадавалі галінкі рабіны, дуба, а гаспадары атрымлівалі ліпавую галінку. Пры абыходзе двароў дзяўчаты, якія суправаджалі Куста неслі з сабой вялікі, сплецены таксама з зеляніны, вянок. На гэты вянок гаспадары, у якіх пабывалі віншавальнікі, завязвалі чырвоную стужку пасля таго як загадаюць жаданне. А пасля заканчэння абраду гэты вялікі вянок з стужкамі кідалі ў воду, каб усе жаданні спраўдзіліся.



У палесскім абрадзе “Ваджэнне куста” доўгі час захоўваліся рэшткі дахрысціянскага светапогляду, паводле якога Сусвет падзяляўся на дзве часткі – “гэты свет”, дзе жыў сам чалавек, іншыя людзі, і “той свет”, дзе знаходзіліся загадкавыя звышнатуральныя сілы, духі, міфічныя істоты, памерлыя продкі. У дні святаў два светы – рэальны і сакральны – часова аб’ядноўваліся. Найважнейшымі прадстаўнікамі сакральнага свету ў дні каляндарных свят лічыліся пераапранутыя персанажы, якія мелі права на своеасаблівыя рытуальныя паводзіны. Упрыгожаныя зелянінай дзяўчына або маладая жанчына – “куст” – успрымаліся ў далёкім мінулым як прадстаўнікі “таго свету”, свету памерлых, якія могуць уплываць на жыццё жывых. Але пад уздзеяннем сацыяльна-культурных фактараў у абрадзе “куста” адбываліся трансфармацыйныя змены як па форме, так і па змесце. Галоўны персанаж абыходу паступова змяняў сваё аблічча: поўная пакрытасць галінкамі, арыентаванымі да зямлі – вянок з галінак дрэў на галаве – вэлюм з галінкамі клёну – проста вэлюм. Змяняліся і функцыі абраду: амаль паўсюдна ён набываў шлюбную накіраванасць.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 559 с. : каляр. іл.
2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2009. – 863 с. : каляр. іл., 1 электрон.-апт. дыск (CD-Rom).
3. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1 / Т. Б. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 910 с. : каляр. іл.

Литош Н.В., магистрант
заочной формы обучения
Научный руководитель – Наумчик В.Н.
доктор педагогических наук, профессор

## ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ ПОДРОСТКОВ В ПРОЦЕССЕ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ЭКСКУРСИОННО-ТУРИСТИЧЕСКОГО ОБЪЕДИНЕНИЯ

*Патриотизм — не просто разговоры о том, как мы любим Родину.*
*Это ежедневная работа на ее благо.*
*А. Г. Лукашенко*

Сегодня, когда мы наблюдаем крушение идеалов, нравственных и духовных ориентиров, тема патриотического воспитания становится особенно актуальной.